*Пролетарыі усіх краін, еднайцеся!*

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 58 (72) | Серада, 5 снежня 1945 г.

**Няхай жыве Сталінская Канстытуцыя — Канстытуцыя перамогшага сацыялізма!**

**Няхай жыве тварэц новай Канстытуцыі Вялікі Сталін!**

## ДЗЕНЬ СТАЛІНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ

Сёння народы Совецкага Саюза святкуюць Дзень Сталінскай Канстытуцыі.

Дзевяць год назад Надзвычайны VIII Усесаюзны з'езд Советаў прыняў новую Канстытуцыю СССР, названую народам па імені яе тварца—Сталінскай Канстытуцыяй. Дзень зацверджання Канстытуцыі СССР—5 снежня—аб'яўлен усенародным святам—Днём Сталінскай Канстытуцыі.

Усенароднае свята—Дзень Сталінскай Канстытуцыі наша краіна адзначае ў гэтым годзе ў абстаноўцы міра заваяванага ў жорсткай барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і японскімі імперыялістамі.

Совецкія людзі выконваючы словы Канстытуцыі: „Абарона айчыны ёсць свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна СССР“, з беззаветнай храбрасцю абаранялі сваю дзяржаву ў Вялікай Айчыннай вайне. Яны абаранілі сваю зямлю, заваяванні соцыялізма, свае правы, запісаныя залатымі літарамі ў Сталінскай Канстытуцыі.

Наша краіна, прайшоўшая праз агонь вайны, стала яшчэ больш магутнейшай. Цяпер у перыяд мірнага развіцця, як адзначыў у сваём дакладзе таварыш Молатаў. „У нас няма больш важнай задачы, чым задача замацаваць нашу перамогу...“ Працаўнікі совецкай зямлі спакойны за свае будучае. Яны знаюць, што соцыялістычная, планавая арганізацыя народнай гаспадаркі забяспечвае няўхільны рост вытворчых сіл совецкага грамадства, выключае ўсякую магчымасць крызісаў і безработіцы. Совецкі народ ідзе ўперад да новых перамог, святлейшых вяршынь комунізма.



Народы Заходніх абласцей, з'еднаўшыся у адзінай Беларускай дзяржаве, пры паўсядзённай дапамозе ўсіх народаў Совецкай дзяржавы, аднаўляюць сваю гаспадарку, сваю культуру.

Разумеючы, што ад своечасовага выканання абавязацельстваў перад дзяржавай залежаць поспехі краіны ў будаўніцтве, сяляне Акцябрскага Аніскавіцкага, Дзеткаўскага, Першамайскага, Дзямідаўшчынскага сельсоветаў завяршылі выкананне збожжанарыхтовак. Многія вёскі раёна выканалі план бульбанаставак. Зараз гэтыя сельсоветы здаюць хлеб у фонд Перамогі.

Свята Сталінскай Канстытуцыі адзначаецца ў дні, калі наша краіна рыхтуецца да выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Працоўныя нашага раёна, як і ўвесь совецкі народ, з вялікай актыўнасцю і задавальненнем рыхтуюцца да выбараў. З новымі поспехамі ў працы, яшчэ больш згуртавацца вакол большэвіцкай партыі, вакол Вялікага Сталіна прыйдуць яны да выбараў у Вярхоўны орган Совецкай дзяржавы.

Няхай жыве Сталінская Канстытуцыя—самая дэмакратычная ва ўсім свеце!

Няхай жыве тварэц Канстытуцыі перамогшага соцыялізма Вялікі Сталін!

# КАНСТЫТУЦЫЯ ПЕРАМОГШАГА СОЦЫЯЛІЗМА

Споўнілася 9 год з таго дня калі Надзвычайны VIII з'езд Советаў прыняў новую Канстытуцыю СССР, якую наш народ назваў іменем яе стваральніка—Сталінскай Канстытуцыяй.

Да 1936 года ў нашай краіне была Канстытуцыяй, прынятая ў 1924 годзе. Гэта быў перыяд НЭПа, калі ў краіне яшчэ існавалі капіталістычныя элементы, і пагэтаму наша Канстытуцыя мела рад зграпічэнняў для асобных непрацоўных праслояк насельніцтва.

У дакладзе аб праекце Канстытуцыі Саюза ССР 25 лістапада 1936 года таварыш Сталін ахарактарызаваў змены, якія адбыліся ў краіне з 1924 года. У прамысловасці быў поўнасцю выцеснен капіталізм, а соцыялістычная форма вытворчасці стала „безраздзельна пануючай сістэмай у галіне нашай прамысловасці" (Сталін).

У сельскай гаспадарцы мільёны дробных аднаасобных сялянскіх гаспадарак аб'едналіся ў калгасы, сталі на соцыялістычны шлях. На базе ўсеагульнай калектывізацыі была ліквідавана кулацтва.

У галіне таваразварота і гандлю к 1936 году нарадзіўся і ўмацаваўся новы гандаль, совецкі гандаль без купцоў і спекулянтаў.

„Такім чынам,—гаварыў таварыш Сталін,—поўная перамога соцыялістычнай сістэмы ва ўсіх сферах народнай гаспадаркі з'яўляецца цяпер фактам.

А што гэта азначае?

Гэта азначае, што эксплаатацыя чалавека чалавекам знішчана, ліквідавана, а соцыялістычная ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці ўгрунтавана як непахісная аснова нашага совецкага грамадства".

У выніку ліквідацыі ўсіх эксплаататарскіх класаў у нашай краіне застаўся рабочы клас. Застаўся клас сялян. Засталася інтэлігенцыя.

Глыбокія змены ў жыцці краіны, эканомікі і класавай структуры нашага насельніцтва далі магчымасць унесці адпаведныя змены ў Канстытуцыі СССР у напрамку далейшай дэмакратызацыі выбарчай сістэмы, увядзення ўсеагульных, роўных і прамых выбараў пры тайным галасаванні.

Сталінская Канстытуцыя ўзаконіла і замацавала тое, што ўжо было дабыта і заваявана. Яна ўзаконіла правы грамадзян Совецкага Саюза: права на працу, права на адпачынак, на асвету, права на забяспечаную старасць.

СССР многанацыянальная дзяржава. Яна аб'ядноўвае 16 саюзных рэспублік. Сталінская Канстытуцыя ўзаконіла раўнапраўе ўсіх рас і нацый. У мэтах ажыццяўлення гэтага раўнапраўя па Канстытуцыі Вярхоўны Совет СССР—вышэйшы орган дзяржаўнай улады ў краіне складаецца з двух раўнапраўных палат: Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей. У Совет Нацыянальнасцей кожная саюзная рэспубліка, не залежачы ад яе велічыні і колькасці насельніцтва пасылае 25 дэпутатаў, аўтаномная рэспубліка —11 дэпутатаў, аўтаномная вобласць—пяць дэпутатаў.

Сталінская Канстытуцыя выпрацавана пры дапамозе ўсяго совецкага народа. У абмеркаванні праекта Канстытуцыі прымала актыўны ўдзел уся краіна. Па прапанове таварыша Сталіна VIII Надзвычайны з'езд Советаў прыняў аднагалосна многалікія папраўкі да праекта Канстытуцыі, унесеныя насельніцтвам.

Дзевяць год жывуць нашы народы пад сонцам самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі. За гэты час мы перажылі цяжкае выпрабаванне—вайну з фашысцкай Германіяй. Гэта вайна не была для нас нечаканасцю. Яшчэ на VIII з'ездзе Советаў таварыш Сталін гаварыў:

„Цяпер, калі мутная хваля фашызма аплёвывае соцыялістычны рух рабочага класа і змешвае з гразёю дэмакратычныя імкненні лепшых людзей цывілізаванага света, новая Канстытуцыя СССР будзе абвінаваўчым актам супроць фашызма, гаворачым аб тым, што соцыялізм і дэмакратыя непераможны (апладысменты). Новая Канстытуцыя СССР будзе маральнай дапамогай і рэальным падспор'ем для ўсіх тых, хто вядзе зараз барацьбу супроць фашысцкага варварства".

Словы таварыша Сталіна збыліся. Совецкі народ на галаву разбіў гітлераўскіх варвараў.

12 снежня 1937 года совецкі народ выбіраў дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР. Тысячы арганізацый і грамадстваў працоўных пры выстаўленні кандыдатаў называлі імя Вялікага Сталіна. Першым дэпутатам народа быў выбран таварыш Сталін. Выбары закончыліся выдатнай перамогай нашай совецкай дэмакратыі,

10 лютага будзем выбіраць Вярхоўны Совет СССР другога склікання. Няма сумнення, што і на гэты раз выбары пройдуць як вялікая ўрачыстасць совецкага народа.

**І. Крыскавец.**

## Вялікія правы

Цяжкія часы перажылі мы пры панскай Польшчы. Я працаваў на сельскай гаспадарцы. Ад няхваткі зямлі, мне прышлося пакінуць свой двор і пайсці ў заработкі. Але працуючы ў кулакоў і багацеяў, я ўсяроўна не меў куска хлеба. За ўсякую праві́ннасць пазбаўлялі працы.

Толькі пры ўладзе Советаў я адчуў вялікія правы чалавека. Сталінская Канстытуцыя гарантуе права на працу, на адпачынак, на асвету, права на забяспечаную старасць. Канстытуцыя дае шырокія правы грамадзянам выбіраць вышэйшы орган улады і быць выбранымі. Гэтыя правы даў нам Вялікі Сталін, совецкая ўлада.

**К. Саковіч.**

Загадчык шавецкай майстэрні райпрамкамбіната.

В.а. рэдактара
П. СПІРЫДОН[illegible]

ГЛ 14879 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Совецкая вуліца, дом № 1.